Падтрымай "Вясну" на PATREON

Вынесены прысуд валанцёру выбарчага штаба Святланы Ціханоўскай

12.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Аляксандр Дабрыянік

У судзе Савецкага раёна Мінска 12 кастрычніка вынесены прысуд па крымінальнай справе палітвязня Аляксандра Дабрыяніка, якога вінавацілі па ч.1 арт. 342 КК РБ (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).

Справу разглядаў суддзя **Сяргей Шаціла**, пракурор – **Уладзімір Рабаў.**

Аляксандр Дабрыянік - ураджэнец горада Слоніма, актывіст і валанцёр у выбарчым штабе Святланы Ціханоўскай. Быў затрыманы 24 траўня. Да суда ўтрымліваўся ў СІЗА №1 Мінска.

Беларускай праваабарончай супольнасцю быў прызнаны палітычным зняволеным.

У ходзе судовага следства стала вядома, што 16 жніўня 2020 года, знаходзячыся ў Мінску, з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадскіх поглядаў, прыняў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак.



"Прымаў удзел у Маршы Свабоды, слухаў Ляпіса Трубяцкога": судзяць валанцёра штаба Ціханоўскай

Аляксандр Дабрыянік - ураджэнец горада Слоніма, актывіст і валанцёр у выбарчым штабе Святланы Ціханоўскай. Быў затрыманы 24 траўня. Да суда ўтрымліваўся ў СІЗА №1 Мінска.

Пад час судовых спрэчак пракурор казаў, што Дабрыянік прызнаў віну часткова, аднак віна ягоная пацвярджаецца пісьмовымі матэрыяламі справы, у тым ліку канфіскаванай у яго сімволікай і іншымі друкаванымі матэрыяламі (!).

Запрасіў суд пакараць абвінавачанага трыма гадамі абмежавання волі ў папраўчай установе адкрытага тыпу. Таксама просіць суд задаволіць грамадзянскі пазоў прадпрыемства “Мінсктранс” у поўным аб’ёме, г.зн. у памеры 5 988 рублёў.

Бок абароны звярнуў увагу, што ў аснову доказу віны Дабрыяніка былі пакладзеныя ўскосныя доказы, ён не меў пры сабе незарэгістраванай сімволікі, на праезную частку не выходзіў і не перакрываў рух грамадскага транспарту.

У сваім апошнім слове Аляксандр Дабрыянік казаў, што на той момант лічыў, што не з'яўляўся актыўным удзельнікам масавага мерапрыемства, не згодзен, што перакрываў вуліцы, прасіў суд разабрацца справядліва.

Пасля перапынку суддзя Шаціла вынес прысуд: прызнаць Дабрыяніка вінаватым і прызначыць пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі ва ўстанове адкрытага тыпу ("хімія") тэрмінам на тры гады.**




Вызваліць Аляксандра Дабрыяніка ў залі суда да прызначэння яму месца і ўмоў пакарання.


Пакінуць пад арыштам кампутар і тры мабільныя тэлефоны.

Прызнаць права за прадпрыемствам "Мінсктранс" звярнуцца ў парадку грамадзянскага судаводства па спагнанне матэрыяльнай шкоды ў памеры 5 988 рублёў.

Твитнуть







Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў


Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY